**Фарміраванне духоўнасці ў навучэнцаў сродкамі беларускага тэатральнага мастацтва**

Усе мы прараслі з зямлі,
Як колас жытні,
Як ключы крыніцы
Што б'юць штодня,
Бягуць ад веку ў век…
Н. Галавач

## Што для нас спадчына?...

Там, дзе нарадзіўся чалавек, там вытокі яго жыцця, там пачатак яго жыццёвай дарогі. А адна з галоўных каштоўнасцей жыцця чалавека – жаданне яго вывучаць гісторыю свайго роднага краю, яго культуру, народныя звычаі, абрады. Дзякуючы народнай культуры, чалавек фарміруе ў сабе духоўнасць, уменне супрацьстаяць жыццёвым нягодам, а таксама мае магчымасць развіць у сабе здольнасці і талент заўважаць прыгожае, незвычайнае вакол сябе і адкідаць тое, што мяшае жыць, адбірае здароўе і жаданне тварыць добрыя справы.

Што для вас спадчына? З такім пытаннем мы звярнуліся да навучэнцаў ДУА "Турэцкі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-сярэдняя школа. Радасна адзначыць, што большасць навучэнцаў адказалі, што калі яны гавораць пра спадчыну, то звычайна маюць на ўвазе штосьці вельмі значнае, сімвалічнае – радзіму, бацькоўскую хату, родную мову, але ў той жа час наша спадчына складаецца са шматлікіх простых рэчаў, набытых ці створаных нашымі дзядамі, бацькамі, іншымі роднымі і блізкімі людзьмі. Хочацца яшчэ дапоўніць, што каштоўныя крупінкі спадчыны заўсёды напаўняюць нашы душы непаўторным разуменнем таго, што заўсёды існавала і існуе (што вельмі радуе) духоўная сувязь паміж пакаленнямі.

## І душа, і сумленне…

Пяты год у ДУА "Турэцкі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-сярэдняя школа" працуе тэатральная студыя "Батлейка". Перш чым паказваць прадстаўленні, навучэнцы падрабязна вывучылі гісторыю ўзнікнення батлейкі, вызначылі для сябе, што беларускае тэатральнае мастацтва мае складаную і багатую гісторыю. Узнікшы з народнай творчасці, яно на працягу ўсяго развіцця жывілася старажытнымі абрадамі, ігрышчамі, святамі, гульнямі, карагодамі. А

самае галоўнае, што батлейка – гэта неацэнны сродак далучэння да дзедаўскай спадчыны, знаёмства з бібілейскімі легендамі і іх народнай інтэрпрэтацыяй.

Сапраўдны знаўца фальклору, чалавек, які ўмее зацікавіць, захапіць навучэнцаў, настаўнік пачатковых класаў Гунько Алена Аляксандраўна правяла цыкл заняткаў па тэме "Гісторыя народнага тэатра "Батлейка". Настаўніца ўмела накіроўвала работу вучняў, і пад чулым кіраўніцтвам яны з цікавасцю даведаліся аб тым, што беларускі народны тэатр батлейка з'яўляецца адным са старажытных відаў беларускага мастацтва. Назва "Батлейка" (Bethleem) паходзіць ад горада Віфлеем, дзе, згодна біблейскай легендзе, нарадзіўся Ісус Хрыстос. Пра сувязь паходжання батлейкі з біблейскай тэмай сведчаць кананічныя сюжэты пастаноўкі «Цар Ірад». Іншыя варыянты назвы гэтага старажытнага тэатра – вяртэп (лялечнае прадстаўленне), батлеемка, астмейка ці жлоб.

А далей галоўным для дзетак стала стварэнне канструктыўнай асновы батлейкі. З душэўнай цеплынёй яны апавядалі бацькам, сябрам аб тым, што для лялечнага беларускага тэатра характэрны тыя ж элементы, што і для заходне-еўрапейскага тэатра эпохі Сярэднявечча. Батлейка як жанр мастацтва сваім рэпертуарам адлюстроўвае сацыяльныя і рэлігійныя працэсы, а таксама культурныя патрэбы людзей. Па-першае, гэта праяўляецца ў сцэнаграфіі, таму што сярэдневяковыя містэрыі былі ўласцівы для рэпертуару батлейкі. Па-другое, характэрнай асаблівасцю рэпертуару батлейкі было тое, што ен падзяляўся на «высокі» жанр – рэлігійная тэматыка – і «нізкі» – сатырычныя сцэнкі з народнага жыцця. У адпаведнасці з гэтым будавалася канструкцыйная аснова батлейкі – падзел скрыні на «неба» і «зямлю»: «рай» знаходзіўся з левага боку верхняга яруса, а «пекла» з правага боку ніжняга.

Работа ў батлеечным тэатры захапіла дзетак. Іх душа рвецца тварыць, адраджаць народнае мастацтва, захапляць ім акружаючых. Як гаворыць Алена Аляксандраўна "Сумленне педагога патрабуе тварыць самому дабро і вучыць дабру сваіх навучэнцаў."

**Своеасаблівая іскра дзіцячай душы**

Батлеечны тэатр дапамагае навучэнцам развіваць шматлікія здольнасці: акцёрскія, рэжысёрскія, драматургічныя, музычныя, мастацкія, дызайнерскія, архітэктурныя, мадэльерныя, шавецкія, літаратурныя, і шмат іншых. Гэта ўніверсальны і эфектыўны сродак навучання і выхавання, негледзячы на сваю старадаўнасць. У гэтым прычына таго, што прымаць удзел у пастаноўках батлейкі падабаецца

навучэнцам розных узростаў. Нехта стварае эскізы касцюмаў, дзяўчынкі-старшакласніцы робяць выкрайкі для касцюмаў, хлапчукі шчыруюць над стварэннем дэкарацый. Творчая група сумесна з Аленай Аляксандраўнай і музычным кіраўніком Сас Людмілай Сяргееўнай складаюць сцэнарыі. Ужо на сённяшні дзень створаны зборнік батлеечных прадстаўленняў на беларускай мове, што расказваюць пра жыццё Іісуса Хрыста, пра гісторыю свята “Пакровы”, “Каляды”, “Вялікдзень”. Амаль увесь каляндарны цыкл рэлігійных свят знаходзіць сваё адлюстраванне ў праграме батлейкі. З цікавасцю і захапленнем слухаюць гледачы, як многа гадоў таму за гарамі, за лясамі з’явілася ў небе новая зорка. І здарылася гэта зімовым вечарам, калі нарадзіўся Іісус Хрыстос.

Свята Вялікдзень – народнае вясновае свята. З прыняццем хрысціянства яно атрымала духоўны сэнс і ачышчальную моц, з’яўляецца выключна радасным і ўрачыстым у шэрагу ўсіх хрысціянскіх свят.

А ў ніжнім ярусе хлопчыкі і дзяўчынкі паказваюць сцэны з жыцця беларускага сялянства. Цяплом матчынай хаты, непаўторнай радасцю свайго, спрадвечнага, беларускага напаўняецца душа гледачоў, калі глядзяць інтэрмедыі, складзеныя на аснове падзей з жыцця беларусаў, калі разам з бабуляй Аленай сустракаюць валачобнікаў. Тут і жарты, і прыпеўкі, і народныя песні. Радасна назіраць, як ажываюць батлеечныя лялькі, зробленыя з дрэва і апранутыя ў касцюмы з розных тканін. Кожная лялька нясе індывідуальныя прыкметы персанажа: ёй надаюцца вострахарактарныя ці велічныя рысы.

Педагогі сапраўды ўмеюць цаніць своеасаблівую іскру, якую ўбачылі ў душах дзяцей. Дапамагаюць развіваць іх таленты, заахвочваюць добрым словам іх працу, падтрымліваюць іх творчую і дабрачынную дзейнасць маральна. Усе намаганні накіраваны дзеля сапраўднага – жыцця душы, а значыць, захавання дабрыні і любові.

**Урокі дабрыні, якія вучаць дарыць цудоўнае людзям**

Жыццё чалавека тады будзе сапраўдным, калі ён навучыцца дзяліцца цеплынёй сваёй душы з іншымі.

Удзельнікі тэатра “Батлейка” стараюцца паказваць сваё мастацтва акружаючым, вучацца рабіць дабро, дарыць цудоўнае імгненне людзям. За час, што навучэнцы займаюцца ў тэатральнай студыі, яны неаднаразова выступалі з праграмай перад выхаванцамі дашкольных груп, перад жыхарамі аграгарадка Турэц. Вельмі часта праводзяць сустрэчы з дзеткамі, якія часова жывуць у сацыяльным прытулку ў в. Палужжа . Як кажуць мудрыя людзі, шчодрасць не столькі ў тым,

каб даваць многа, колькі ў тым, каб даваць своечасова. Часам, як маленькім так і дарослым не хапае крышачку ўвагі, добрага слова. Адраджэнне лепшых традыцый міласэрнасці, выхаванне ў дзяцей пачуцця адказнасці, гуманнасці і гатоўнасці рабіць дабро – гэта таксама адна з асноўных задач педагогаў дадатковай адукацыі, кіраўнікоў тэатральнай студыі “Батлейка”. Хочацца, каб усім, хто дакранецца да творчасці маленькіх артыстаў, стала б хораша на душы, як у цёплым куточку, светлым і добрым, як сонечны дзень.

Т.В. Гарох, намеснік дырэктара па
выхаваўчай рабоце ДУА “Турэцкі вучэбна-
педагагічны комплекс дзіцячы сад-сярэдняя школа”

### *70-летию Великой Победы посвящается…*

## Невзорванные мины памяти…

Это слова со стихотворения известного белорусского пэта Рыгора Барадулина: "Воспоминания – невзорванные мины"… То, что хранится памятью, может на самом деле тяжёлым камнем годы и годы лежать в глубине сердца. А потом опять и опять всплывает, и так сильно начинает болеть никак не заживающая душевная рана. И от обиды хочется плакать, но слёзы высохли с годами, только сердце и душа болят и болят, и нет конца этой боли.

Осторожно поглаживая ласкавую руку пожилой, но такой красивой женщины, хочу спросить её о войне и не нахожу слов, боюсь расстроить, расстривожить незаживающие раны. Таисия Алексееевна Соболевская, учительница, которая всю свою жизнь посвятила детям, сразу же угадывает мои мысли и начинает рассказывать сама. Она говорит о счастливом детстве современных детей, о покое, о чистом небе над головой. «Мне не пришлось увидеть детства, война отняла», - с горечью произносит женщина.

Всю свою трудовую жизнь она отдала школе, преподавала русский язык и литературу, родом из огненной деревни Синявская Слобода, которая расположилась на берегу полноводной реки Неман. В войну она была совсем маленькой девочкой, но хорошо помнит, как ворвался карательный отряд в её, как говорит Таисия Алексеевна, такую необыкновенно красивую деревеньку, как жгли дома, грабили, расстреливали людей. Болью проникнуто каждое слово её рассказа-воспоминания о погибших земляках, о маме, которая всё время старалась заслонить своим телом малышку и её младшего брата, как плакали женщины, и дым закрывал солнце. Так убедительно и ненавязчиво запоминающе звучит рассказ о трудном детстве, о материнском подвиге. Со слезами на глазах учительница старается донести мне глубокую печаль-переживание о судьбе своей маленькой Родины. Но в тоже время в интонации голоса легко угадываются и нотки гордости за подвиг односельчан, за своего отца, который прошёл почти всю войну и погиб, к сожалению, в самом её конце, меньше месяца не дожив до победного дня. С большим вниманием слушаю, как восторженно и ласково говорит Таисия Алексеевна о своей маме, которая одна вырастила детей, выучила их и долгие годы проработала в родном колхозе имени И.Д. Черняховского. А потом продолжает опять с болью в голосе вспоминать военные события:

«…В 1942 году, в сентябре, пошла в первый класс в деревне Синявская Слобода. Учил нас очень талантливый педагог, глубоко человечный, Владимир Иванович Наумович. Но счастье длилось недолго. Шла война. Вокруг леса и деревня стала партизанской. Все жители помогали партизанам, делились с ними последним. И вот в июне 1942 года к нам приехали немцы. Собрали молодёжь, стариков, детей около колхозного сарая, положили на землю, окружили, начали устраивать допрос.

Жители деревни пообещали вести себя мирно, не поддерживатьсвязь с партизанами. Немцы, в свою очередь, пригрозили, что если дальше жители будут помогать партизанам, то они сожгут деревню.

Беда не заставила себя ждать долго. В конце октября снова появились фашисты. Никому ничего не говоря, к каждому дому подносили горящий факел. Дома полыхали, повсюду слышались крики, стоны. Спасти никому ничего не удалось, всё погибло в страшном огне: добро, хозяйство, скот. Пришлось искать прибежище в соседней деревне, просить милостыню, начинать жить заново. Вот так мы оказались в деревне Турец, где жили родители мамы, родственники. Но и здесь все находились под страхом. Не было покоя ни днём, ни ночью. Детство кончилось, так и не успев начаться. В восемь лет приходилось делать всё: жать, молотить, работать вместе с мамой.

В июле 1944 года наши войска освободили Турец и окрестные деревни. Отца сразу же вызвали в Мирский военкомат, отправили на передовую. Жить было нелегко, но вокруг находились добрые люди, которые всегда стремились помочь. Постепенно возобновилась учёба в школе, стала налаживаться мирная жизнь. Помнится, как мы ходили по деревне, собирали посылки на фронт с надеждой, что что-то попадёт нашим односельчанам, родным. Также писали на фронт письма.

Всю жизнь в моей душе живёт чувство благодарности нашим учителям, которые, несмотря на военные невзгоды, старались согреть наши детские души. Нас приняли в пионеры, учили петь песни, танцевать, играть в спектаклях. И так получалось, что некогда было грустить.

А в 1945 году, в апреле, незадолго до конца войны, получили похоронку на отца, и не только мы одни. Плакали многие в деревне, одно страшное горе сблизило всех. Но нужно было перенести это и продолжать жить: учиться, работать, дружить… Как хорошо, что на моём жизненном пути всегда встречались добрые люди. Они как родники, которые не давали погибнуть всходам новой жизни…»

Так спокойно, тихонько рассказывает мне Таисия Алексеевна о тех страшных военных событиях, словно боясь испугать, поранить ненароком мою ещё неокрепшую душу. Не говорит она мне о том, что и теперь ночью часто просыпается от собственного крика. Всё снится ей огненная деревня, а в глубине сердца не дают покоя невзорванные мины памяти.

И мне не хочется уходить с этого уютного дома, где царит атмосфера добра и душевного тепла. Опять прикасаюсь к ласковым рукам пожилой, красивой женщины, смотрю в её глаза и любуюсь ими. И снова Таисия Алексеевна угадывает мои мысли. Она ласково улыбается и негромко говорит: «Приходи ко мне чаще, не забывай. А я буду молиться, чтобы вам и вашим детям никогда не довелось пережить того, что увидела в своём детстве я. То огненное прошлое всегда со мною, как бы далеко от него я не уходила…»

**Т.В. Горох, заместитель директора по воспитательной работе. ГУО «Турецкий учебно-педагогический комплекс детский сад-средняя школа»**

***70-годдзю Вялікай Перамогі прысвячаецца…***

**“Ішла маладосць іх да мая – па самай вялікай вайне….”**

Ю.Друніна

Вясновы месяц май, як ніякі іншы месяц, багаты на святы. Але ўсё ж сярод свят адно адзначаем асабліва –Дзень Перамогі. І святкуем яго штогод радасна і шчыра. Гэта не выпадкова. У нашай краіне па-сапраўднаму няма ніводнай сям’і, якую б вайна не закранула сваім чорным крылом. Хтосьці прайшоў праз цяжкасці партызанскага жыцця, хтосьці не дачакаўся з фронту бацьку і пасля вайны рос сіратой, абдзелены яго любоўю і ласкай… Нехта згубіў у полымі ліхалецця ўсю сям’ю. А хтосьці ваяваў сам, як, напрыклад, цудоўны чалавек, былы старшыня калгаса, жыхар вёскі Браносава, што знаходзіцца ў Турэцкім сельскім Савеце, Саўка Уладзімір Уладзіміравіч. Здаецца, зусім нядаўна гэты сталы прыгожы мужчына са шчырай усмешкай на твары сардэчна вітаўся са знаёмымі, аднавяскоўцамі… Усім хацелася з ім пагутарыць, даведацца аб жыцці, дакрануцца душой да чалавечай мужнасці і мудрасці…

Уладзімір Уладзіміравіч, нястомны працаўнік, увесь час сваё жыццё дзяліў на дзве часткі: тое, што было да вайны, і тое, што пасля яе. А вайна – гэта як чорная рыска, правал, глыбокі яр, які нельга засыпаць, пра які нельга забыць. Ён добра памятаў, як наступалі нямецкія акупанты, як ляжалі на дарозе дзве маладыя забітыя жанчыны, а каля іх малое дзіця – трохгадовая дзяўчынка. “Мы забралі з сабою гэту дзяўчынку,- з боллю ў голасе ўспамінаў Уладзімір Уладзіміравіч,- яна была з намі больш як два тыдні, а потым мы завезлі яе ў медсамбат.”

Дарогі вайны – цяжкія, палітыя крывёй. У 1942 годзе Уладзімір Уладзіміравіч быў паранены ў нагу, потым служба ў 483 палку 177 Любанскай дывізіі. Былы франтавік ізноў жа ўспамінаў: “Першы раз пайшлі мы ў разведку і вярнуліся ні з чым. Быў моцны вецер, непагадзь, і мы заблудзіліся, з цяжкасцю адшукалі сваіх баявых сяброў. А вось наступная аперацыя прайшла з поспехам. На лясной паляне нашым салдатам сустрэлася невялічкая зямлянка. З асцярожнасцю зайшлі туды і ўбачылі 12 нямецкіх сувязных і афіцэра. Іх абязброілі, прывялі ў свой полк. Невялікае здарэнне вайны. А колькі было такіх здарэнняў за доўгія чатыры гады”.

Пасля вайны Уладзімір Уладзіміравіч вярнуўся ў сваю родную вёску. Патрэбна было аднаўляць разбураную гаспадарку, паступова залечваць, хай сабе і невылечныя, раны вайны. Дзень Перамогі для сапраўднага

абаронца Радзімы Уладзіміра Саўкі,  як і для ўсіх ветэранаў, быў заўсёды днём пазбаўлення ад цяжкасцей, голаду, слёз, гора; гэта самае светлае свята на ўсё жыццё.

Мы, сёняшняе пакаленне, часта задумваемся над тым, што колькі б ні прайшло гадоў – і дзесяць, і дваццаць, і семдзясят– адносіны нашы да Дня Перамогі, да тых, хто падараваў нам гэты радасны дзень, не мяняюцца. У свет прыходзяць і падрастаюць новыя пакаленні, якіх, здаецца, не павінны былі б хваляваць тыя незнаёмыя і далёкія ад іх цяперашняга жыцця жахі. А яны іх хвалююць. Сённяшнія юнакі і дзяўчаты у Дзень Перамогі разам са старэйшымі ідуць да помнікаў, нясуць кветкі, адчуваюць боль незваротнай страты. Той дзень застаўся навечна ў памяці народа, ён – у геннай памяці кожнага з нас.

Няма ўжо сёння сярод нас цудоўнага чалавека, шчырага працаўніка, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Саўка Уладзіміра Уладзіміравіча, а мы ізноў перачытваем радкі яго ўспамінаў і па-новаму асэнсоўваем кожнае слова.  А 9 мая  збяромся на нашай плошчы ў цэнтры роднага аграгарадка Турэц каля помніка загінуўшым   воінам, каб выказаць словы ўдзячнасці тым, каго  горда завём “салдаты Перамогі”.…

Семдзясят гадоў нас аддзяляе ад той іхняй маладосці, што зведала і партызанскія зямлянкі, і франтавыя акопы, налёты авіяцыі і артабстрэлы, кроў, слёзы, смерць. А вочы – поўныя жыцця, зіхоткія дзявочыя вочы, якім Богам было наканавана лашчыць, мілаваць позіркам дзіця, каханага, ясноту наваколля, квецень садоў, усё тое, што мы завём цёплым і звыклым – жыццё, мая зямля, Айчына. За яе, за ўсіх нас, цяперашніх, яны ахвяравалі сваёй маладосцю. І як па-рознаму складваўся іхні лёс! Адны, прайшоўшы ўсё пекла вайны, сустрэлі жаданую Перамогу, дайшлі да таго прамяністага Мая, другія так і засталіся маладымі назаўсёды, упісаўшы залатымі літарамі свае імёны ў вечнасць.

Нямногія з іх прыйшлі, нямногія пачулі пераможныя залпы ў Берліне… Паклонімся ім, затрымаем позірк на іхніх тварах і памаўчым, слухаючы, як бушуе вясна… Сямідзясятая  вясна Перамогі, здабытай імі – удзельнікамі вайны.

М. Дз. Стэльмах, настаўнік гісторыі,
кіраўнік клуба “Патрыёты Айчыны”
ДУА “Турэцкі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-сярэдняя школа”